

# БЫВАЙ, ВАЛОШКАВАЕ ЛЕТА! ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ, ФЕСТЫВАЛЬ!

**Як хутка пачаўся форум мастацтваў у горадзе на Дзвіне, так жа хутка праляцелі сем яго яркіх і насычаных дзён. Кожны з іх не быў падобны на папярэдні, праекты на вуліцах горада змяняліся стракатым карагодам, а паўночная сталіца не засынала нават ноччу. Дырэкцыя ўжо падводзіць вынікі XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў і будуе планы на наступны, а мы сабралі самыя яркія моманты апошніх дзён фестывальнага лета.**

## СЕМ ВЯТРОЎ ТВОРЧАСЦІ

Сёлета фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» адзначаў 10-годдзе. Роўна столькі гадоў кожны ліпень артысты розных жанраў на тыдзень ператвараюць культурную сталіцу ў адзін яркі незвычайны перформанс. Сем вятроў — сем творчых напрамкаў, якія традыцыйна размяшчаюцца на сямі пляцоўках горада. Старт фестывалю дало ўрачыстае шэсце па вуліцы Леніна ўвечары 12 ліпеня. Жывыя скульптуры, казачныя персанажы і хадулісты, барабаншчыкі — яркі музычна-акцёрскі натоўп прымусіў цэлы горад на імгненне застыць у захапленні. Самае цікавае, што на гэтым фестывалі няма ганарараў — артысты з розных краін едуць на «Славянскі базар», каб дарыць людзям сваю творчасць бясплатна.

Па 15 ліпеня жыхароў і гасцей горада запрашалі на паказальныя выступленні на палотнах, дэфіле-перформансы, наіўныя спектаклі, электронна-музычныя монаспектаклі, вогненна-піратэхнічныя шоу, цыркавыя выступленні і многае іншае. Сёлета «разынкай» фэсту стаў паўтор усіх рэкордаў, якія свята назбірала за дзесяць гадоў існавання. У іх ліку — «Тысяча вершаў аб Віцебску», «Мост пацалункаў» і іншыя.

Упершыню ў горадзе на Дзвіне прайшоў бразільскі карнавал, або самба-фестываль, які сабраў прадстаўнікоў Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кірава, Кастрамы і змог поўнасцю паглыбіць віцябчан і гасцей у лацінаамерыканскую культуру. Яркае шэсце з танцорамі і барабаншчыкамі прайшло па вуліцы Калініна і скончылася двухгадзінным выступленнем. Праект ужо налічвае звыш 200 чалавек і, верагодна, стане традыцыйным.

## ГАЛАСЫ 15 КРАІН

12 ліпеня ў міжнародным прэсцэнтры адбылася цырымонія лёсавання XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». Сёлета ў ім узялі ўдзел прадстаўнікі 15 краін свету, і ўпершыню на фестывалі прысутнічаў канкурсант з Паўднёвай Афрыкі. Яе прадставіў 27-гадовы выканаўца Thami MBATHA. Свае шчаслівыя нумары ўдзельнікам конкурсу прапанаваў абраць паштальён, на паштоўцы з выявай фестывальнага Віцебска былі нумары першага конкурснага дня, на канверце з адваротным адрасам — другога.

14 ліпеня на цырымоніі ўрачыстага закрыцця 33-га Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» запаветную «Ліру» атрымала Караліна Балан з Малдовы. Першую прэмію конкурсу журы прысудзіла вакалісту з Казахстана Ерназару Жубану, другое месца раздзялілі італьянка Мар'ям Танкрэдзі і расіянка Кацярына Кузіна.



Фота БелТА.

Беларус Валерый Чучман у першы дзень выступіў пад нумарам «11», прадставіўшы кампазіцыю на беларускай мове «Купала — зорка Беларусі». Выканаўчае майстэрства Валерыя журы ацаніла ў 63 балы з 70 магчымых. А спявак адзначыў, што цеплыня і падтрымка гледачоў адчуваліся па апладысментах і іх энергіі, якая натхняла яшчэ больш. У другі конкурсны дзень наш зямляк выканаў кампазіцыю «Памяці Каруза» і атрымаў 65 балаў. У выніку Валерый Чучман раздзяліў трэцяе месца з балгарскай канкурсанткай Нэвенэ Пяйковай, а таксама разам з прадстаўніцай Расіі Кацярынай Кузінай атрымаў спецпрыз Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Спецыяльнага прыза «Славянская надзея» ўдастоена Калерыя з Латвіі. Узнагароду спявачцы ўручыў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі, старшыня аргкамітэта фестывалю Ігар Петрышэнка. Спецыяльную прэмію імя Уладзіміра Мулявіна за лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы, высокае выканаўчае майстэрства атрымаў прадстаўнік Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Thami MBATHA. Яшчэ ў першы конкурсны дзень ён сарваў неверагодныя апладысменты з шасцітысячнай залы, выканаўшы хіт «Выйду ноччу ў поле з канём».

Спецыяльную ўзнагароду «Песня — шлях да садружнасці» МТРК «МІР» за высокае майстэрства ў захаванні нацыянальных традыцый атрымала прадстаўніца Узбекістана Саліма.

## У ГОНАР ЗНАЧНЫХ ЮБІЛЕЯЎ

На плошчы Перамогі прэзентавалі перасоўную мабільную экспазіцыю «Наш доўг — помніць!», прысвечаную 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Загадчык культурна-адукацыйнага аддзела Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярына Казлоўская расказала, што галоўная мэта экспазіцыі — пазнаёміць людзей з асноўнымі вехамі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. «Экспазіцыя працуе з мая па верасень, летась наведалі 27 населеных пунктаў Беларусі і пабывалі ў Калузе. На «Славянскім базары» за першыя паўгадзіны з выставай азнаёміліся больш за сто чалавек — інтарэс у наведвальнікаў высокі», — расказала яна.

У бібліятэцы імя Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна Пушкінскі запаведнік «Міхайлаўскае» запрашаў на інтэрактыўныя заняткі па гістарычным пісьме і віртуальную экскурсію па музеі-запаведніку. Сёлета адзначаецца 225-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага паэта, таму гэтай тэме прысвечаны некалькі праектаў выставачнай праграмы фестывалю. Так, у фае канцэртнай залы «Віцебск» адкрылася выстава мастака Ігара Шаймарданава «А. С. Пушкін. Дзве зімы, два леты», а таксама прайшлі народныя гульні пушкінскай пары «Куфар».

У мастацкім музеі прэзентавалі выставу «Ленінградцы. Жывапісны партрэт» са збору Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга.


Фота БелТА.

На вялікіх палотнах размясціліся партрэты акцёраў, народных артыстаў, акадэмікаў, Герояў Сацыялістычнай працы — людзей, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё культуры Ленінграда. Экспазіцыя адкрыта ў Віцебску да 8 верасня.

## ЭКСКЛЮЗІЎ АД МАЙСТРОЎ

У «Залатым коле горада Віцебска «Дзвіна» на вуліцах Ільінскага і Чайкоўскага разгарнуўся традыцыйны «Задзвінскі кірмаш». Больш за 450 рамеснікаў з Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Кітая і іншых краін прадставілі свае ўнікальныя вырабы і падзяліліся сакрэтамі творчасці. У яркіх палатках можна было знайсці оніксавыя фігуркі з Пакістана, сувеніры з керамікі, посуд з дрэва, разнастайныя ўпрыгажэнні, тэкстыльныя, ваўняныя вырабы, сувеніры з саломкі, бяросты, лазы, гліны, скуры, цацкі — вязаныя, шытыя, валяныя з воўны.

На вуліцах Пушкіна, Талстога і Суворава таксама раскінуліся бясконцыя рады беларускіх і расійскіх майстроў. На гістарычнай вуліцы Суворава быў зроблены акцэнт на прадметы дэкору (карціны, габелены, экібаны), а таксама ўпрыгажэнні з халоднага мармуру і фетру. Можна было знайсці магніты і іншую сувенірную прадукцыю з выявамі культурнай сталіцы на любы густ.

Чароўныя фігуркі жывёл з гліны прадставіла пара з Гомеля Аляксандр і Марыя Аўраменкі. Яна — уручную вылеплівае катоў, соў, цмокаў, а муж беражліва размалёўвае. Наталля і Пётр Церахавы прыехалі ў Віцебск з Уладзіміра, прывезлі безліч кухоннага тэкстылю, а яшчэ жаночыя і мужчынскія касцюмы ў рускім стылі. Пара займаецца пашывам вырабаў самастойна, а аднымі з унікальных рэчаў, якія прывезлі на кірмаш, сталі тэкстыльныя грэлкі на чайнікі і каструлі.

Гаварыць пра безліч вырабаў з валошак — нязменнага сімвалу фестывалю мастацтваў — можна бясконца: завушніцы і бранзалеты, акуратныя вяночкі, значкі і пярсцёнкі. А яшчэ футболкі, шоперы, кашулі з выявай кветкі разыходзіліся ў «Горадзе майстроў», як гарачыя піражкі.

## НА КАНЦЭРТНЫХ ПЛЯЦОЎКАХ

У рамках Дзён Саюзнай дзяржавы на сцэне канцэртнай залы «Віцебск» упершыню паказалі мюзікл «Казка пра цара Салтана», музыку да якога напісаў народны артыст Расіі Аляксандр Зацэпін. Дарэчы, Аляксандру Сяргеевічу на фестывалі ўручылі спецыяльны дыплом Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Мюзікл стаў выдатным падарункам для дзяцей і дарослых.

У Віцебскай абласной філармоніі з сольным канцэртам выступіў легендарны італьянскі музыкант Нэла Сальтца. Ва ўсім свеце ён вядомы пад тытулам «труба Марыконе», а ў фестывальным Віцебску музыкант выступіў у суправаджэнні аркестра народных інструментаў імя Леаніда Іванова з поўным аншлагам.

Расійскі спявак і народны любімец Яраслаў Сумішэўскі запрасіў на сольны канцэрт, прысвечаны яго 40-годдзю. Артыст ужо неаднойчы бываў з выступленнямі ў Віцебску, прызнаецца, што гэту публіку вельмі любіць і цэніць. А ўдзячныя слухачы не пераставалі купаць вакаліста ў апладысментах.

Доўгачаканае шоу Ані Лорак прайшло на адкрытай танцпляцоўцы каля канцэртнай залы «Віцебск». Нягледзячы на лівень, які перад канцэртам значна сапсаваў настрой, каля сцэны сабраліся сотні прыхільнікаў творчасці артысткі. Ані Лорак прызналася, што вельмі сумавала па фестывальным горадзе і разам са слухачамі выканала свае хіты і новыя песні з альбома «Востраў».

З поўным аншлагам у трэці раз на сцэне Летняга амфітэатра прайшоў КВЗ-канцэрт, які сёлета сабраў пяць каманд. Беларусы «Доктар Хаўс», каманда са Смаленска «Трыёд і Дыёд», «Равенькі», «Горад Магас» з Інгушэціі і «Раісы» змагаліся за Кубак «Славянскага базару». Ацэньвала гумар зорнае журы, у склад якога ўвайшлі Анатоль Ярмоленка, Віталь Кульбакоў, Леанід Купрыда і іншыя. На сцэне каманды паказвалі не толькі свае лепшыя нумары, але і рэпрызы з мясцовым віцебскім каларытам. Сёлета Кубак адправіўся ў Іркуцк, яго прысудзілі камандзе «Раісы». Прызам глядацкіх сімпатый адзначылі каманду «Равенькі».

14 ліпеня на сцэне канцэртнай залы «Віцебск» прайшоў сольны канцэрт Вікторыі Алешка, на якім артыстка прэзентавала новы альбом «Сапраўднае золата». «Прэзентацыя майго новага альбома на «Славянскім базары» для мяне вялікі гонар. Я хачу падзякаваць ад усёй душы музычнай медыякампаніі, якая арганізавала гэтае цудоўнае свята, і дырэкцыі фестывалю, дырэктару Глебу Лапіцкаму за гэтую магчымасць», — сказала спявачка.

Цырымонія ўрачыстага закрыцця фестывалю мастацтваў сёлета была аб'яднана з другім конкурсным днём выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». Пасля абвяшчэння вынікаў на сцэну выходзілі зоркі айчыннай і замежнай эстрады. Музычныя падарункі жыхарам і гасцям горада на Дзвіне дарылі Любоў Успенская, Ані Лорак, Марыям Мярабава, Міхаіл Турэцкі і яго хор і іншыя. Члены журы конкурсу маладых выканаўцаў Зара, Роза Рымбаева і Томас Н'эвергрын таксама падарылі спагаднай публіцы свае вядомыя кампазіцыі, і кожнаму з іх гледачы ў Летнім амфітэатры дзякавалі бурнымі апладысментамі.

Учора ў культурнай сталіцы адгучалі апошнія акорды «Славянскага базару». Радавала прыхільнікаў сваёй творчасцю расійская спявачка Любоў Успенская на сольніку ў канцэртнай зале «Віцебск», а ўвечары ў Летнім амфітэатры адбыўся традыцыйны гала-канцэрт «Шансон ТБ — УСЕ ЗОРКІ». На сцэну выйшлі Кацярына Галіцына, Рада Рай, Марына Дзявятава, група «Лесоповал» і «Рождество», іншыя артысты.

## АБСАЛЮТНЫЯ РЭКОРДЫ

Вынікі XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» на прэс-канферэнцыі з журналістамі (а сёлета мерапрыемствы форуму асвятлялі каля 500 прадстаўнікоў СМІ) падвёў дырэктар фестывалю Глеб Лапіцкі. Ён расказаў, што гэты форум ужо ўвайшоў у гістарычны летапіс «Базару», бо на яго акрэдытавалі звыш сямі тысяч удзельнікаў. «42 краіны ўзялі ўдзел у нашым свяце творчасці, больш за 11 мільёнаў праглядаў мы атрымалі на нашых анлайн-рэсурсах. Сайт фестывалю наведалі 120 краін. Больш за сто транспартных адзінак, якія абслугоўвалі «славянку», праехалі за гэты час больш за 120 тысяч кіламетраў — а гэта значыць, што мы са «Славянскім базарам» тройчы абышлі ўсю планету», — заключыў Глеб Аляксандравіч.

На такой прыемнай ноце скончыўся форум мастацтваў. Чарговы раз ён сабраў на гасціннай віцебскай зямлі тысячы ўдзельнікаў з розных куткоў свету пад дэвізам «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**